— На «Славянскі базар» аднойчы прыязджалі прадстаўнікі прэзідэнцкага палка Расіі. Каля 16 чалавек іх было. І мы разам выступалі на адной сцэне, — гаворыць Павел Гур'янаў. — Шчыра скажу, узровень у нас аднолькавы.

### «СЛУЖБА Ў РОЦЕ ДАЗВАЛЯЕ ТРЫМАЦЬ СЯБЕ Ў РУКАХ»

— Калі было зразумела, што патрэбна ісці служыць, і я пайшоў у ваенкамат, мне прапанавалі ісці служыць сюды, — распавядае Яўген Гамазін. — І расказалі пра перавагі службы ў роце. Гэта было лета, тады ўсе былі ў эйфарыі ад Венесуэлы. Сказалі, што будзе магчымасць удзельнічаць у мерапрыемствах, у тым ліку і з першымі асобамі дзяржавы. Цікава, ганарова. Але самае галоўнае, як кажа наш камандзір роты, гэтая служба не дае права на памылку. Што дазваляе трымаць сябе ў руках і быць патрабавальным да сябе. А гэтыя якасці ў любой прафесіі, ды і ў жыцці, на мой погляд, вельмі важныя.

**Настасся ЗАНЬКО.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**


Малодшы сяржант Дзмітры ХАМЛЮК.

# «Найвышэйшы пілатаж» легендарнага беларуса Міхаіла Каснерыка

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

*Каснерык гартае «Пашпарт лётчыка», дзе запісаны кожны палёт, пачынаючы з самага першага.*

*Больш за дзве з паловай тысяч гадзін у небе!*

***— Цяпер, мабыць, і не знойдзеш лётчыка з падобнай «арыфметыкай»?***

— Зараз мала лётаюць у сувязі з эканамічнымі ўмовамі, гаручага не хапае...

***— А ў якім узросце вы завяршылі службу?***

— Спісаўся я ў 1973-м, у 50 гадоў.

***— Любіце лётаць на грамадзянскіх самалётах?***

— Не вельмі: там мяне вязуць, я бездапаможны (*смяецца*).

...Вось паглядзіце, у гэтай кніжачцы ёсць раздзел «Лётныя здарэнні». 21 жніўня 1942 г. я сеў на І-16, гэтым «карапузіку», на кукурузнае поле. У маі 1944-га была вымушаная пасадка на лес на самалёце Як-1. Дзявацца не было куды, я ішоў «брыючым палётам» на малой вышыні.

***— Не катапультаваліся, а пасадзілі самалёт?***

— Тады катапульты не было. А скокнуць з парашутам не мог: ужо не было вышыні... Я прарубіў самалётам такую просеку — і зараз здзіўляюся, як не згарэў і чаму. Саджаў самалёт на вярхушкі дрэў, як на грунт. Спачатку «паляцела» левае крыло — машыну развярнула. Потым адлятае рухавік ад удару аб сасну, машыну яшчэ раз разварочвае... Мяне выратавала, што не было лабавога ўдару. Самалёт перавярнуўся на кабіну.

***— Самалёт усмятку, а вы ... усталі і пайшлі?***

— Ад самалёта застаўся толькі хвост і кабіна. У лесе працавалі рабочыя, яны падышлі, прыпаднялі крыху кабіну, і я адтуль вылез.

У 1947-м было вымушанае пакіданне самалёта ЛА-7, і раптам нечакана заклініла-зачапіла парашут. А зямля ўсё бліжэй...

***— Мабыць, ужо і з жыццём развіталіся?***

— Не было часу на гэта, трэба ж хуценька думаць, што рабіць. Удалося вывернуцца: парашут раскрыўся, і я «загудзеў»: у купале парашута аднаго кліна няма... Парашуты не капронавыя былі ў той час, а шаўковыя, хуткасць велізарная. Зноў пашанцавала. Сінякоў набіў, вядома... Ботаў не было (сарвала ў паветры), кашулю і штаны парваў, прычым кашуля — літаральна ў стужачкі. На танцы не было ў чым ісці.

***— Можа, і праўда, лёс... Вы, дарэчы, верыце ў лёс?***

— Не. Мой бацька быў вернікам. Ён увесь час маліўся. Гаварыў: я цябе, напэўна, у Бога вымаліў...

* * *

***— У адным з інтэрв'ю вы гаварылі, што пасля першага палёта «без ног» Марэсьеў заплакаў. Няўжо і праўда даў волю такім эмоцыям чалавек, які пераадолеў столькі ўсяго?***

— Чысцюткая праўда. У студзені 1943-га я быў інструктарам у Іванаве. Перавучваў лётчыкаў для палётаў на новых самалётах.

***— А вам усяго 19!***

— Марэсьеў старэйшым быў, і ўжо капітан. Я здзівіўся напачатку: чаму менавіта за мной яго замацавалі?

А як было? Мы расчышчаем стаянкі самалётаў ад снегу. Холадна, марозна, усе ў цёплым адзенні: першыя лётныя камбінезоны з вялікім каўняром, гэткія карагі-пальчаткі мехавыя, унты з сабачай шэрсці — цёплыя, на войлаку... Прылятае транспартны самалёт на аэрадром, апошнім вылазіць чалавек з палачкай, у скуранай лётнай куртачцы Елізаветы англійскай.

***— Што за куртачка такая?***

— Каралева Англіі Елізавета падарыла для нас, лётнага саставу, мехавыя лётныя касцюмы. Курткі чымсьці падобныя на цяперашнія дублёнкі-«прапіткі»: прыгожа зробленыя, з замочкамі, кішэнькамі... Ну, вазьмі ды і сарвіся ў мяне з языка: «Госпадзі, гэта што за піжон? Халадзіна, а ён...» Лётчыкі гавораць: «Гэта ж Марэсьеў — мы яго і самі так жартам называем».

***— Ён і насамрэч любіў «пощеголять», прыгожа апрануцца?***

— Ён быў вельмі сціплы чалавек. Ніколі не выпячваўся. Пратэзы асвоіў дасканала.

...Нас, помню, сабралі, зачыталі загад аб замацаванні лётчыкаў за інструктарамі. І называюць: «Капітан Марэсьеў! Інструктар — лейтэнант Каснерык». Іншыя інструктары былі яшчэ маладзейшыя за мяне, іх выпускалі, у асноўным, сяржантамі з авіяцыйных школ, а я пасля авіяшколы скончыў вышэйшае авіяцыйнае вучылішча каманднага саставу. У мяне і налёт большы, і тэарэтычная падрыхтоўка лепшая, так што камандзіры разлічылі ўсё правільна.

Ён вылез з самалёта ЛА-5 (для таго часу «Лавачкін» — гэта, безумоўна, быў экстра-клас!), я падышоў: стаіць тварам да кабіны, плечы ўздрыгваюць. Думаю: што здарылася, мо кепска стала? А ў яго слёзы — градам, буйныя такія слёзы... Абняў мяне: «Камандзір, я ж баявы лётчык, я лятаць буду!» Ён не проста лятаў — узорна ваяваў, на Курскай дузе збіў 6 фашысцкіх самалётаў, а ў жніўні 1943-га яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

***— Ці праўда, што Марэсьеў і танцаваць мог — як паказана ў фільме «Аповесць аб сапраўдным чалавеку» па аднайменным творы Барыса Палявога?***

— Так, гэта было. Ён хацеў паказаць, даказаць, што самастойна можа працаваць і лятаць.

Ужо пасля вайны мы сустрэліся ў Маскве, разгаварыліся, і ён прызнаўся: губляў прытомнасць, але вырашыў усё-такі прарвацца ў неба.

* * *

*Палкоўнік Дыяген Іваноў быў добра знаёмы з Марэсьевым, яны часта сустракаліся. Калі Марэсьеў даведаўся, што Іванова накіроўваюць служыць у Беларусь, папрасіў перадаць прывітанне свайму колішняму інструктару: «Скажы яму: калі Барыс Палявой даў мне вядомасць, Каснерык даў мне крылы».*



**Такім быў 19-гадовы лётчык-інструктар Міхаіл Каснерык у 1943 годзе, калі дапамагаў Аляксею Марэсьеву зноў «набыць крылы».**

*Іваноў прысвяціў Міхаілу Канстанцінавічу верш, дзе ёсць вось гэтыя радкі:*

*От природы, бесспорно,*
*талантлив.*
*Если точно —*
*то «звездный пилот».*
*По-военному собран, приветлив,*
*«Высший класс» —*
*его каждый полет.*
*.........*
*О всех наградах говорить*
*не станем,*
*Что, как броня,*
*прикрыли вашу грудь.*
*Пять «Красных Звезд»*
*в единый ряд поставили,*
*Хотя «Медаль из золота»*
*достойно оценила б*
*весь ваш труд!*

**— А якое было маё першае пытанне пры сустрэчы, Міхаіл Канстанцінавіч, — пра «Залатую Зорку»!**

— Калі вам па сакрэце сказаць, дык золата мне ўручылі.

***— ???***

— Мяне ўзнагародзілі антыкварным швейцарскім кішэнным гадзіннікам «Павел Вінтэр»: «Падпалкоўніку Каснерыку за ўмелыя дзеянні ў складанай абстаноўцы. Міністр абароны СССР Грэчка».

Няпростым было выпрабаванне першага звышгукавога самалёта СУ-9 на грунтовых аэрадромах у 1959-м. Ён быў капрызны: ствараўся спешна-тэрмінова. Таму што ў 1954 годзе тры англійскія самалёты-разведчыкі на вышыні 20 тысяч метраў хадзілі над Масквой па 40 хвілін, змяняючы адзін аднаго. Фатаграфавалі размяшчэнне зенітна-ракетных комплексаў вакол сталіцы — і іх нічым не маглі дастаць.

Паглядзець новую машыну, якая першая ўсё-такі ўтаймавала амерыканцаў (палёты шпіёнаў спыніліся), прыляцела шмат начальства, у тым ліку двойчы Герой Савецкага Саюза генерал-лейтэнант Савіцкі (бацька касманаўткі Святланы Савіцкай), канструктар Павел Іосіфавіч Сухой... Але паказ не атрымаўся, бо на вышыні 11 тыс м адмовіла аўтаматыка рухавіка, энергетыка. Самалёт быў цалкам абясточаны. А ёмістасці акумулятара як рэзервовага электрасілкавання хапала ўсяго на 8 хвілін. Прадпрымаў усё магчымае, ды дарэмна. Вырашыў катапультавацца — не спрацаваў страляльны механізм. Перадаў па рацыі: катапульта не спрацавала, аўтаматыка не працуе, бывайце.

***— Варыянтаў не было?***

— Ніякіх. Тут, адназначна, чаго трэба чакаць: выбух, пажар. Але ... выбуху няма, машыну я трымаю, яна пакачваецца з крыла на крыло...

***— І куды вы пасадзілі самалёт?***

— А куды ісці: дождж хлешча, вышыня ўжо 350 м. Усё рабіў па інтуіцыі. Уяўляў у прасторы, дзе прыкладна знаходжуся... Выйшаў з аблокаў, убачыў светлую палоску на гарызонце — і, вядома, я «затанцаваў». Удалося прызямліцца на сенакос, знёс 9 стагоў сена!..

***— Не страшна першаму садзіцца ў зусім новы самалёт, калі дакладна не ведаеш, што з ім можа здарыцца?***

— Разумееце, выпрацоўваецца прафесіяналізм.

***— Адрэналін, як кажуць? Можа, чыста падсвядома ўжо і хочацца адчуць чарговую порцыю рызыкі?***

— Калі, дапусцім, лётчыку не даць палятаць тыдні са два — ён з глузду з'едзе. Ён ірвецца ў неба!

* * *

***— Нямногія могуць сказаць: сам Іосіф Сталін цiснуў мне руку. Цікава, а ці моцны быў той поціск генералісімуса?***

— Не, у 1949-м гэта быў ужо зусім хворы чалавек. Камандуючым Ваенна-Паветраных Сіл Маскоўскай акругі быў яго сын Васілій Іосіфавіч Сталін. Я быў камандзірам групы суправаджэння флагмана парада, на борце якога знаходзіўся В. Сталін.

***— Па-рознаму пішуць: ці на дачы Сталін з вамі сустракаўся, ці ў альтанцы? Як было на самай справе?***

— Аднойчы паступіла каманда камандзіру палка (а наш полк размяшчаўся за 15 км ад Калужскай плошчы, на аэрадроме Цёплы Стан): паставіць на дзяжурства маю тройку. Сам Васіль Сталін загадаў... Нядзеля. У чатыры гадзіны паступае каманда запусціць рухавікі. Запускаем. Мне гавораць: «Звяжыся з Сокалам».

***— «Сокал» — гэта хто?***

— Пазыўны Васілія Сталіна... Звязаўся. Пытаецца: «Над Кунцавам зялёную пляму бачыш? Над ёю — па поўнай праграме, але нізка не зніжайся». Я ўсё зразумеў.

***— Мелася на ўвазе: паказаць фігуры найвышэйшага пілатажу над лясным масівам?***

— Так. Я думаю: мабыць, сабраўся генералітэт, яны «паддалі» і хочуць павесяліцца — то добра! А мы маладыя, выбачайце, дурнаватыя былі. Пахуліганілі: Масква — забароненая зона, а тут — дазволілі.

...Ну, і «пасылаў» нас Васіль Сталін далёка, і шмат слоў «прыемных» гаварыў — я ўсе слоўнікі перабраў, значэнне не знайшоў!

***— А калі ён вас так?***

— Па рацыі. Ён жа бачыў, што мы надта нізка зніжаемся — і «чысціў» ад душы.

***— Мабыць, грузінскім матам, калі ёсць такі...***

*Смяецца:*

— Цяжка было разабраць! Ну, мы адпілатаваліся, селі. Далажылі камандзіру палка аб выкананні задання. А ён: «Ага, выканалі заданне. Дык вось, за вамі прыехалі. Вы ж там хуліганілі!». Кажу: не тое каб хуліганілі, але сапраўды нізкавата было. «Было нізкавата, а цяпер вам будзе цяжкавата». Я і мае два «вядомыя» селі ў машыну, куды едзем — не ведаем, вадзіцель з намі не размаўляе, шторкамі закрыўся. Машына спынілася: «Таварышы лётчыкі, вы ў альтанцы пасядзіце. З вамі будзе размаўляць таварыш Сталін». Ногі адразу чамусьці пругкасць згубілі...

***— Значыць, гэта праўда: ад самога слова «Сталін» людзі губляліся?***

— Былі ў шокавым стане! Я думаю: ну ўсё, канец... Сядзім мінут 15 (мабыць, далі нам час ачухацца), а потым выходзіць з двухпавярховага доміка світа, наперадзе ідзе чалавек — сгорблены, зусім аблыселы, зямліста-шэры твар у вяснушках. У белым касцюме і ў ... дамашніх сандалях. Паўсагнутая левая рука. Толькі па ёй я і здагадаўся, што гэта Сталін.

***— Ён зусім быў не падобны на шматлікія партрэты, якія віселі паўсюль?***

— Абсалютна не падобны!.. Мы, безумоўна, навытяжку, у струначку. А ён: «Таварышы лётчыкі, сядайце». Я пачаў дакладваць: «Таварыш генералісімус Савецкага Саюза...» — ён мяне абрывае: «Іосіф Вісарыёнавіч». Даў зразумець, што яго менавіта так можна называць. Я далажыў па форме, а ён: «Скажыце, на гэтым самалёце Як-17 можна ваяваць?» Гэта быў першы рэактыўны самалёт. Гавару: «Таварыш Сталін, калі шчыра...» — ён рэзка перабівае: «А я няшчырыя размовы і не вяду! Я паўтараю пытанне...»

Нібыта не ведае! Я здагадаўся: яму было важна думку радавых лётчыкаў пачуць. Патлумачыў падрабязна, чаму нельга. Ён спытаў: а якім, па-вашаму, павінен быць самалёт? Сказаў: амерыканцы запусцілі ў серыю знішчальнік F-104 «сейбр»... «Адкуль вы ведаеце?» — «Рыхтуюся паступаць у Акадэмію імя Жукоўскага, чытаў артыкул у часопісе «Life».

***— Вы ведаеце англійскую мову?***

— І ён спытаў пра гэта. Не, артыкул ў перакладзе чытаў... Расказаў падрабязна пра новы самалёт. Ён выслухаў уважліва: «Пахвальна, што нашы лётчыкі цікавяцца авіяцыяй праціўніка. Дык вось, на наступных парадах вы будзеце лётаць на зусім іншых самалётах — нашай, айчыннай, вытворчасці, не горш за амерыканскія». І праз паўзу сказаў мне: «А ў акадэміі вы вучыцца будзеце».

Гэта адбывалася 10 верасня 1949 года, і ўжо 21 верасня я быў слухачом акадэміі.

***— Мабыць, Сталін штосьці і падарыў вам на памяць?***

— Нас добра пакармілі і на развітанне ўручылі вялікія каробкі: каньяк, шакалад, духі...

* * *

***— Хто вашы бацькі, Міхаіл Канстанцінавіч?***

— Бацькі мае — чыстакроўныя, карэнныя беларусы *(націск робіць менавіта на апошняй літары)*. Сам я добра ведаю і беларускую, і ўкраінскую мовы — хоць нарадзіўся ў Сібіры. Бацька з вёскі Пераносіны, што пад Баранавічамі. Маці з вёскі Палонка, што непадалёк. Маці каталічка, бацька праваслаўны. Маці было 15 гадоў, а яна ў пана ўжо эканомкай працавала, усе ключы ў яе былі за поясам, вяла гаспадарку...

Калі бацька пайшоў на фронт у 1914 годзе, маці з двума дзецьмі стала бежанкай. На падводах цар вывез іх у Сібір, а там апынуліся ва ўкраінскім сяле. Бацька знайшоў іх ужо пасля рэвалюцыі, там і аселі. А ў 1931 годзе вярнуліся на радзіму, пасяліліся ў вёсцы Лошыца. Божухна, які прыгожы куточак, там было іменне пана Любанскага, проста цуд! Мы беднавата жылі, есці асабліва не было чаго, але якая прырода была!..

***— Можна асабістае пытанне? Дзяўчаты, мабыць, чарадой за вамі бегалі: прыгажун, дый лётчык, дый герой!***

— Было!

***— Колькі разоў былі жанаты?***

— Адзін-адзіны. З жонкай раслі разам, у Лошыцы. Такая добрая, адчайная дзяўчына! Калі маленькімі былі, яна толькі з хлопцамі і сябравала. Рэгіна — хімік-тэхнолаг. Дзве дачкі ў нас. Лена скончыла інстытут культуры, выйшла замуж за ваеннага, мыкалася па гарнізонах; Вольга скончыла політэхнічны інстытут, вядзе аддзел у праектным інстытуце.

***— Колькі гадоў вы разам з Рэгінай Анісімаўнай?***

— Дробязь — усяго 61 год, з 1950-га...

* * *

**Вось пра што падумалася. У Міхаіла Каснерыка, нашага легендарнага земляка, няма звання Герой Савецкага Саюза.**

**Але ў нашай суверэннай краіне ёсць званне «Герой Беларусі» — за выключныя заслугі перад дзяржавай і грамадствам.**

**Тое, што Міхаіл Канстанцінавіч Каснерык — сапраўдны герой Радзімы, не выклікае ніякіх сумненняў.**

**Дык можа, цалкам лагічным будзе цяпер, напярэдадні 70-й гадавіны пачатку Вялікай Айчыннай вайны, адпаведным чынам разгледзець пытанне аб наданні афіцыйнага статусу Героя чалавеку, які сутнасна пацвердзіў гэтае званне ўсім сваім жыццём?..**

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

# КОДЭКС БРЫГАДЫ

***(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)***

## «Думаў, усё будзе па-іншаму»

А што ж самі салдаты? Як ім служыцца ў такой багатай на гісторыю і заслугі брыгадзе?

Аднаго з радавых мне ўдалося разгаварыць.

— Служу ўжо крыху больш як паўгода, — прызнаецца хлопец з Мядзела **Дзмітрый Лакатош**. — Служба падабаецца. Думаў, што ўсё будзе па-іншаму. Падабаюцца адносіны камандзіраў да нас, радавых. Усё своечасова, аператыўна. Землякоў маіх тут чалавек пяць служыць. Стараемся дапамагаць адзін аднаму, адчуваецца, што служым з аднаго раёна. А служыць мне — яшчэ пяць з паловай месяцаў.

**Падпалкоўнік Сяргей Вараловіч** у брыгадзе паўтара года, столькі ж працуе намеснікам камандзіра брыгады па ідэалагічнай рабоце. За плячыма Сяргея Мікалаевіча ўжо не адно месца службы: Мар'іна Горка, Гродна, Бабруйск...



— Дух патрыятызму і патрыятычнае выхаванне ў нашай брыгадзе перш за ўсё, — гаворыць падпалкоўнік. — Асабовы склад граматна падкаваны як у гісторыі Беларусі, так і ў яе сучаснасці. Праводзім сустрэчы з ветэранамі Афгана, Вялікай Айчыннай. Салдаты заўсёды задаюць цікавыя пытанні. Ведаючы баявы шлях нашай брыгады, ведаючы, як цяжка давалася перамога, стараюцца падтрымліваць традыцыі. Да таго ж салдаты ганарацца тым, што служаць у нашым злучэнні, менавіта ў гвардзейскім злучэнні, як вядома — гвардыя непераможная. І з усімі цяжкасцямі яны спраўляюцца.

Асноўны кантынгент ваеннаслужачых — з Гомельскай вобласці, таксама — з Мінска і Мінскай вобласці. На сёння мы прызвалі новае папаўненне — 533 ваеннаслужачыя, з якіх толькі 46 чалавек — з брэсцкага кірунку, астатнія — нашы. Каля 1600 вайскоўцаў тэрміновай службы — і я практычна кожнага ведаю ў твар.

* * *

«А гэта — помнік камандзіру трэцяй арміі генерал-лейтэнанту Гарбатаву. Помнік у г. Арол на вул. Садовай, — працягвае **Святлана Гаўрылава**. — Гэта адзіны помнік на постсавецкай прасторы, які прысвечаны камандзіру дывізіі — пасмяротна ён атрымаў званне Героя Савецкага Саюза.

...Нашы воіны пачалі аперацыю «Баграціён». Знакамітая Рагачоўска-жлобінская аперацыя, аўтарам якой быў Ракасоўскі, 24 лютага вызвалены Рагачоў. Пасля вызвалення Арла мы сталі 120-й гвардзейскай, а пасля вызвалення Рагачова — Рагачоўскай дывізіяй. Мы вызвалілі не толькі Беларусь: 27 ліпеня — Беласток (за гэта многія нашы палкі атрымалі назву «беластоцкія»). Гарады Мельзак, Вортміт і Хайлігенбайль... Апошні бой далі 7 мая 1945.

Нашы воіны і сёння часта бываюць у Арле.»

Захаванне традыцый, клопат пра бяспеку дня сённяшняга і памяць пра дзень мінулы. Вось ён — кодэкс брыгады.

**Ілья ЛАПАТО. Фота Надзеі БУЖАН.**

## ДОМ ДЛЯ АВІЯТАРАЎ

**Напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Беларусі ў дванаццацікватэрным службовым доме ў Лідзе справілі ўваходзіны сем'і авіятараў 116-й штурмавой авіябазы і 206-га цэнтра падрыхтоўкі лётнага саставу.**

**Гэты дом больш за дваццаць гадоў стаяў недабудаваным у старым Паўднёвым ваенным гарадку. І вось спецыялісты будаўнічай арганізацыі «Вертыкаль XXI стагоддзе» яго капітальна адрамантавалі і падрыхтавалі да засялення. Праўда, большасць авіятараў працягвае жыць у інтэрнатах, і таму ўжо сфарміраваны 115-кватэрны кааператыў «Гвардзеец».**

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# «ЛЮБІМЫЯ ПЕСНІ ВАЙСКОЎЦАЎ»

**Рубрыку вядзе палкоўнік Уладзімір ВАРАПАЕЎ, начальнік—мастацкі кіраўнік Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, заслужаны артыст Беларусі**



Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл Беларусі — адзін з вядучых творчых калектываў краіны. Ён быў створаны ў лютым 1938 года. У час Вялікай Айчыннай вайны баявы шлях ансамбля пралягаў у складзе Заходняга фронта — пад абстрэламі і бамбёжкай, у спёку і непагадзь...

Сёння калектыў добра вядомы не толькі ў нашай краіне. З поспехам ансамбль выступаў на прэстыжных Міжнародных фестывалях у Германіі, Іспаніі, Польшчы, Італіі, Францыі, Партугаліі... Некалькі гадоў таму хор ансамбля быў запрошаны ў Парыж для ўдзелу ў канцэрце на французскім тэлебачанні, дзе выступаў разам з сусветна вядомай спявачкай Мірэй Мацье.

На базе ансамбля былі праведзены Першы і Другі конкурсы беларускай ваенна-патрыятычнай песні. Адметны, таленавіты калектыў браў актыўны ўдзел у тэлемарафонах «Памяць» і «Чарнобыльскі набат», у шматлікіх дабрачынных акцыях, выступаючы ў дамах састарэлых, дзіцячых дамах, школах-інтэрнатах. Няма ніводнага воінскага гарнізона, ніводнага горада ў Беларусі, дзе б ні выступалі ваенныя артысты.

У склад ансамбля ўваходзяць хор, аркестр, салісты, балетная група — гэта дазваляе ствараць разнастайныя па стылі і змесце праграмы.

У студзені 2007 года ансамбль быў уганараваны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Музычнае мастацтва».

Уладзімір Варапаеў кіруе Акадэмічным ансамблем песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь вось ужо 7 гадоў. Нарадзіўся ён у г.п. Круглае Магілёўскай вобласці, скончыў Магілёўскае музычнае вучылішча імя М.А. Рымскага-Корсакава, ваенна-дырыжорскі факультэт пры Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П.І.Чайкоўскага. Неаднаразова прымаў удзел ва ўрадавых канцэртах у якасці галоўнага дырыжора, кіруючы зводнымі аркестрамі і хорамі. Мае таксама і ўласныя сачыненні. Калектыў пад кіраўніцтвам У. Варапаева падрыхтаваў шэраг тэматычных канцэртных праграм, захоўвае і прымнажае назапашаную музычную спадчыну, пастаянна папаўняе рэпертуар новымі творамі беларускіх аўтараў.

Уладзімір Сяргеевіч Варапаеў мае вучоную ступень магістра мастацтваў, у 2008 годзе яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь».

## АФІЦЭРЫ БЕЛАРУСІ

**Муз. У. Карызны** **Верш У. Карызны**



*2. Зоркі вашы*
*на пагонах*
*Не сарваныя з нябёс —*
*Гэта цяжкі пот салёны,*
*Афіцэрскі мужны лёс.*
*З вашых крокаў*
*дзень світае,*
*І шчасліва ля бароў,*
*Сонца птушкай*
*узлятае,*
*Мір вітае і любоў.*

***Прыпеў:***
*Афіцэры Беларусі, землякі,*
*Вам далі*
*душу арліную вякі.*
*Покуль ёсць*
*вы у народа,*
*Будзе нам свяціць свабода,*
*Афіцэры,*
*афіцэры — землякі!*

# «Вялікая падзея ў жыцці кожнага мужчыны»

**Радавы Аляксей Аляксеенка — вельмі цікавы суразмоўца. Не сакрэт, што часта бывае вельмі складана разгаварыць незнаёмага чалавека, тым больш салдата тэрміновай службы. І калі ў першыя дні службы салдаты яшчэ гатовыя выказваць свае эмоцыі і ўражанні, то ўжо праз месяц—два адказы, як правіла, абмяжоўваюцца словамі: «Так точна», «Не».**



Аляксей, як мне падалося, не з іх ліку. Ён вельмі ініцыятыўны і творчы чалавек, да таго ж з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Па спецыяльнасці — будаўнік, а ў душы музыкант. У свой час закончыў музычную школу па класе гітары. Але замест перабору струн ён выбраў ударныя ўстаноўкі і практычна ў дасканаласці авалодаў ігрой на барабане.

Навабранец з радасцю пагадзіўся расказаць пра сябе і падзяліцца першымі ўражаннямі пра службу.

— У нас у гарадскім пасёлку Шуміліна, адкуль я родам, быў цудоўны музычны калектыў. Некалькі гадоў таму мы звярнуліся ў выканаўчы камітэт з просьбай выдзеліць памяшканне для рэпетыцый. Нам пайшлі насустрач. Праз нейкі час педагогі музычнай школы сталі на нас крыўдзіцца. Вядома, класічная музыка заўсёды вечная. Але я перакананы ў тым, што чалавек, які ўмее іграць цяжкі рок, без праблем сыграе і Чайкоўскага, і Моцарта. Але, на жаль, Heavy Metall у школьную праграму не ўваходзіць, таму падлеткі натоўпамі да нас і прыходзілі, прасілі навучыць іграць.

***— Якое меркаванне ў цябе было аб арміі да прызыву на тэрміновую ваенную службу?***

— Дакладнага ўяўлення аб тым, што такое ваенная служба, я не меў. Сябры, якія ўжо адслужылі, штосьці расказвалі, дзяліліся ўражаннямі. Але калі праз гэта праходзіш сам, зведваеш зусім іншыя адчуванні. Асаблівых схільнасцяў да пэўнага роду войскаў у мяне і зусім не было. Ішоў у ваенкамат з думкай: куды адправяць, там і буду служыць.

***— А якія-небудзь страхі і апасенні былі?***

— Арміі я не баюся, ведаю, што ўсё вытрымаю. Не такі страшны чорт, як яго малююць. Забіць не заб'юць, а мужыка зробяць дакладна. Там, на «грамадзянцы», у мяне ёсць выдатныя сябры, дзяўчына Наталля, якая мяне чакае, мама і брат. Таму мая задача — з гонарам і годнасцю адслужыць гэтыя паўтара года і моцным, узмужнелым, пасталеўшым вярнуцца да іх. Трэба сказаць, што я вельмі мірны чалавек. За ўсё сваё маладое жыццё біўся адзін раз у 9 класе. Кінуў курыць, займаюся спортам, не прафесійна, а проста для сябе, каб падтрымліваць добрую форму. Таму і фізічна, і маральна я гатовы да новага перыяду ў сваім жыцці.

На пытанне, ці цяжка было першыя тры дні ў арміі, Аляксей, з уласцівым яму гумарам, адказаў:

— Паверце, працаваць на будоўлі і быць старэйшым сынам у сям'і — гэта таксама не мёд. Пакуль цяжка маральна. Для сябе некаторыя правілы паводзін у калектыве я ўжо вызначыў: стараюся шукаць плюсы ва ўсіх мінусах. Ведаю, што пустымі, як многія кажуць, гэтыя паўтара года для мяне не будуць. Пастараюся з максімумам выкарыстаць іх для самаадукацыі, самавыхавання і ўдасканалення. Не буду ўтойваць, я па жыцці гультай у вучобе. Мне лягчэй насекчы дроў, дапамагчы каму-небудзь штосьці змайстраваць, чым узяць падручнік і вывучыць параграф. Таму, вывучаючы статут, буду развіваць сілу волі і ўседлівасць. А калі ў арміі яшчэ і па барабане часам дадуць пагрукаць, шчасцю майму мяжы не будзе.

Праз тры тыдні...

На кантрольна-прапускным пункце 49-й радыётэхнічнай брыгады марознай лютаўскай раніцай сабраліся бацькі, сваякі, сябры і знаёмыя навабранцаў. Да пачатку ўрачыстых мерапрыемстваў яшчэ паўгадзіны. «А калі мы зможам убачыць сыноў? Як доўга будзе доўжыцца прыняцце прысягі? На які час іх адпусцяць у звальненне?» — цікавяцца прысутныя ў афіцэраў на КПП.

Але вось адчыніліся вароты, і ўсхваляваныя таты і мамы ледзь ці не бегам кінуліся на пляц у надзеі ўбачыць і абняць сваіх сыноў. Здавалася, нават ачапленне не спыніць іх. Але падышоўшы бліжэй да строю, яны неяк разгубіліся. Вось яны — іх крывіначкі, але хто з іх хто?.. Усе аднолькава падстрыжаныя, у камуфляванай форме, са зброяй у руках. І толькі калі салдаты, павярнуўшыся да родных, сталі дрыготкімі ад хвалявання галасамі вымаўляць тэкст прысягі, бацькі беспамылкова пазнавалі сваіх сыноў. Мамы сутаргава церабілі ў руках мокрыя ад слёз насоўкі...

Да радавога Аляксея Аляксеенкі на цырымонію прыняцця прысягі прыехала ўся сям'я. Мы ўжо сустракаліся з салдатам на трэці дзень пасля яго прыбыцця ў армейскі калектыў — таму цікава было даведацца, як змяніліся погляды Аляксея на армейскае жыццё за гэты час.

— Ззаду тры тыдні спасціжэння азоў ваеннай службы. За гэты час пад кіраўніцтвам камандзіраў мы атрымалі пачатковыя веды, набылі ўменні і навыкі, якія спатрэбяцца нам у далейшай службе. Прызнаюся сумленна, у рэальнасці ўсё не так проста, як здавалася ў першыя дні. Армія ёсць армія. І тыя цяжкасці ваеннай службы, якія спачатку былі не бачныя, сёння вельмі яўна адчуваюцца. Але менавіта яны і загартоўваюць характар, прымушаюць уключаць усе ўнутраныя рэзервы і, вобразна кажучы, ісці ў бой. Аптымізму не страчваю, настроены на далейшую службу і з інтарэсам чакаю, што будзе наперадзе.

Што да сённяшняга дня, то я нават не чакаў, што будзе такое хваляванне. На працягу трох тыдняў рыхтаваліся да прысягі — як да вялікага свята. Хаця чаму «як»? Гэта сапраўды свята і, на маю думку, для кожнага мужчыны самая вялікая падзея ў жыцці.

Напярэдадні я вывучыў тэкст Ваеннай прысягі на памяць і без запінкі яго расказваў. Знаходзячыся на пляцы, яшчэ некалькі разоў паўтарыў. Калі пачуў сваё прозвішча, выйшаў, павярнуўся тварам да строю, выцягнуўся ў струнку. Убачыў твары мамы, брата, каханай дзяўчыны, сваіх саслужыўцаў. Сам сабе неаднаразова паўтараў, што гэта адзін раз у жыцці бывае і трэба прачытаць тэкст так, каб і запомнілася на ўсё астатняе жыццё.

Набраў пабольш паветра ў лёгкія і... усё забыўся. Давялося падглядаць. Зазіраю ў папку і раптам усведамляю, што нічога не бачу — радкі расплываюцца перад вачыма. Мне падалося, што гэтыя некалькі секунд доўжыліся вечнасць. Краем вока ўбачыў усхваляваныя твары дарагіх мне людзей...

Узяў сябе ў рукі і з усімі паўзамі і лагічным націскам на патрэбныя словы, не спяшаючыся, выразна пачаў: «Я, радавы Аляксей Аляксеенка...». Вымаўляю — і як быццам бачу сябе збоку. Такое адчуванне было, што вось зараз прагучаць апошнія словы прысягі — і я стану зусім іншым чалавекам, не тым, кім быў учора. Гэта можа зразумець толькі той, хто праз гэта прайшоў.

Далейшая служба радавога Аляксея Аляксеенкі будзе праходзіць у 2288-м асобным радыётэхнічным батальёне 49-й радыётэхнічнай брыгады. Родныя і блізкія вераць, што ён хутка авалодае ваеннай спецыяльнасцю і будзе годна несці службу па ахове паветраных рубяжоў нашай рэспублікі.

**Алена ЗАЦІРКА,**
**Ваеннае інфармацыйнае агенцтва Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь «Ваяр».**

**Фота аўтара.**

## ЭЛЕКТРЫЧКІ: ЗМЕНЫ Ў РАСКЛАДЗЕ

**З 21 лютага зменены расклад руху электрацягнікоў маладзечанскага накірунку.**

Як паведамілі ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, электрацягнік Аляхновічы — Мінск адпраўленнем у 6.19 і прыбыццём у Мінск у 7.33 будзе цяпер адпраўляцца з Аляхновічаў у 6.06 і прыбываць у сталіцу ў 7.20. Электрычка Маладзечна — Мінск адпраўленнем у 4.48 і прыбыццём у Мінск у 6.41 будзе выпраўляцца ў дарогу з Маладзечна ў 4.59, а быць у сталіцы — у 6.48. Электрацягнік Мінск — Маладзечна, які дагэтуль выходзіў з Мінска ў 6.32 і прыбываў у Маладзечна ў 8.22, цяпер будзе адпраўляцца ў 6.38 і прыбываць у 8.22.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Ну і ну!**

## КІРОЎЦА АШТРАФАВАНЫ НА 21 МІЛЬЁН РУБЛЁЎ

**Такое пакаранне, разам з пазбаўленнем права кіравання транспартнымі сродкамі на пяць гадоў, суд Кастрычніцкага раёна г. Гродна вызначыў 30-гадоваму жыхару абласнога цэнтра, які неаднаразова затрымліваўся за рулём у нецвярозым стане. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведамілі ў абласной Дзяржаўтаінспекцыі.**

У лістападзе мінулага года, ноччу Б. на аўтамабілі «БМВ» з вялікай хуткасцю рухаўся па горадзе і на праспекце Кляцкова быў спынены супрацоўнікамі ДАІ. Спрабуючы пазбегнуць адказнасці, ён перасеў з вадзіцельскага сядзення на задняе пасажырскае, а пасажыр заняў яго месца. Аднак гэты «нумар» не застаўся незаўважаным, і кіроўцу запрасілі для разбору ў патрульны аўтамабіль. А медыцынскі агляд пацвердзіў факт знаходжання Б. у п'яным выглядзе.

І ўжо не ўпершыню. У кастрычніку 2009-га судом Ваўкавыскага раёна ён ужо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за паўторнае на працягу года кіраванне транспартам у нецвярозым стане. Але, відаць, пакаранне (штраф у памеры 5 мільёнаў 250 тысяч рублёў і пазбаўленне вадзіцельскіх правоў на пяць гадоў) зноў не падзейнічала. І паколькі Б. здзейсніў наўмыснае злачынства, ужо маючы судзімасць і адбываючы пакаранне, суд не толькі вынес вышэйзгаданыя санкцыі, але і прызнаў у яго дзеяннях наяўнасць рэцыдыву.

Такая ж перспектыва не выключана, калі нарэшце не перагледзіць свае паводзіны, і ў дачыненні 37-гадовага гродзенца М. Спачатку за язду ў нецвярозым стане яго аштрафавалі на 1 мільён 50 тысяч рублёў, а затым, ужо не маючы вадзіцельскіх правоў, ён зноў сеў за руль «пад градусам», за што атрымаў штраф 12 мільёнаў 250 тысяч рублёў. Прычым, калі ў вызначаны тэрмін парушальнік не заплаціць, прыйдзецца развітацца з двума аўтамабілямі, на якія накладзены арышт.

А вось для 26-гадовага Б. «п'яная» язда ў вёсцы Новая Руда Гродзенскага раёна з хуткасцю 110 кіламетраў у гадзіну закончылася аварыяй. Аўтамабіль «Аўдзі» апынуўся ў кювеце, перакуліўся, і тры пасажыры атрымалі цяжкія траўмы. Суд на 2,5 года пазбавіў кіроўцу волі з адбыццём пакарання ў калоніі ва ўмовах пасялення.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

**Здарэнні**

## ВЫРАТАВАЛІ ЧАЛАВЕКА, ЭВАКУЯВАЛІ — 25

**Пажар у кватэры на трэцім паверсе дзевяціпавярховіка па вуліцы Герасіменкі ў Мінску здарыўся а палове дзясятай гадзіны вечара.**

Работнікі МНС з жылля выратавалі жанчыну, якой да прыбыцця брыгады хуткай дапамогі праводзілі рэанімацыйныя мерапрыемствы, паколькі пацярпелая знаходзілася ў непрытомным стане. З дыягназам «атручэнне прадуктамі гарэння» яна была шпіталізаваная. А з вышэйразмешчаных паверхаў дома было эвакуявана 25 чалавек. Мяркуецца, што прычынай здарэння стала неасцярожнасць з агнём пры курэнні сужыцеля пацярпелай.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ВАДА ВЯСНУ ЧУЕ

Нягледзячы на лютаўскія маразы, вада на Прыпяцкім Палессі хоць і запаволена, але паступова працягвае падымацца. Цяпер у раёне вёскі Чэрнічы Жыткавіцкага раёна яе ўзровень складае 544 см, што вышэй за небяспечны на 44 см. Назіраецца ледастаў з палонкамі. Прыпяць ля Петрыкава паднялася да ўзроўню 814 см (небяспечны — 780 см). Тут назіраецца няпоўны ледастаў з рэдкім крыгаходам. Усяго па Гомельскай вобласці падтоплена 15 населеных пунктаў. У іх вада дабралася да 3 жылых дамоў (у Петрыкаве), 81 падворка, 15 сельскагаспадарчых пабудоў. Агульная плошча падтаплення складае некалькі больш за 2 га. Эвакуацыя жыхароў падтопленых падворкаў і жывёл не патрабуецца, паведамляюць у прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ВОСЬ І ЗАКЛЮЧАЙ ДАГАВОР...

**Прыватнае прадпрыемства «Лірык» заключыла з грамадзянамі дагавор на долевае будаўніцтва жылога 34-кватэрнага дома з крамай і падсобнымі памяшканнямі па вул. Брэсцкай у Баранавічах.**

Пры будаўніцтве былі допушчаны грубыя парушэнні праектнай дакументацыі, а гэта прывяло да нанясення страт 21 удзельніку долевага будаўніцтва на суму 283 мільёны рублёў. Па матэрыялах расследавання заведзена крымінальная справа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ
## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ! ОАО «БЕЛФА» г. ЖЛОБИН ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 30 марта 2011 г. ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год и основные направления развития на 2011 год.
2. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год. Утверждение годового баланса и отчета о прибылях и убытках за 2010 год.
3. Об использовании чистой прибыли, полученной в 2010 году, и выплате дивидендов за 2010 год.
4. Утверждение нормативов использования чистой прибыли на 2011 год.
5. Об утверждении Устава Общества в новой редакции.
6. О предоставлении юридическим лицам безвозмездной (спонсорской) помощи.
7. Утверждение размеров вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

**Собрание состоится в конференц-зале Общества по адресу: Гомельская обл., г. Жлобин, Красный проезд, 2.**

**Начало в 14.00.**

**Регистрация участников собрания с 12.00 до 13.45.**

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт; представителю акционера – паспорт и доверенность.**

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании, составляется на основании данных реестра владельцев акций по состоянию на 1 марта 2011 года.

С материалами по проведению собрания можно ознакомиться по месту нахождения Общества с 23 марта 2011 года.

УНП 400076540. **Наблюдательный совет.**



## Уважаемые акционеры ОАО «Світанак» г. Жодино

**24 марта 2011 года**
**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «Світанак»,

**расположенного по адресу: г. Жодино, ул. 8-е Марта, д. 1.**

**Собрание пройдет в актовом зале административно-бытового корпуса предприятия (на четвертом этаже).**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2010 году и основных направлениях деятельности Общества на 2011 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2010 году. Оценка деятельности директора за 2010 год. Отзыв наблюдательного совета о годовом балансе Общества.
3. О результатах проверки ревизионной комиссии финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год.
4. Утверждение годового бухгалтерского баланса Общества и отчета о прибылях и убытках за 2010 год.
5. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении предприятия, и выплате дивидендов за 2010 год.
6. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2011 год, и периодичности выплаты дивидендов за 2011 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Утверждение размера вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Предоставление безвозмездной (спонсорской) помощи в 2011 году.
10. Изложение Устава Общества в новой редакции.

*С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться в библиотеке профкома предприятия с 17 по 24 марта 2011 года (время работы с 8.00 до 17.00).*

*Регистрация участников собрания будет производиться с 13.00 до 14.50 по месту проведения собрания.*

**Начало работы собрания — 24 марта 2011 г. в 15.00.**

*Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 01 марта 2011 года.*

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность!**

УНП 600038919



## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «БЕЛХИМ»

**25 марта 2011 года**
**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Белхим»,**
**расположенного по адресу: г. Минск, ул. Короля, д. 34.**
**Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34 в 14.00.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Отчет об итогах финансово-экономической деятельности в 2010 году и основных направлениях развития на 2011 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2010 году и 1-м квартале 2011 года.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности за 2010 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков.
5. Распределение чистой прибыли (покрытие убытков) и выплате дивидендов за 2010 год.
6. Утверждение направления использования остатка чистой прибыли на 2011 год и 1-й квартал 2012 г.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Утверждение размера вознаграждений членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Утверждение сметы командировочных расходов на 2011 год и 1 квартал 2012 года.
10. Утверждение Устава ОАО «Белхим» в новой редакции.
11. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34 с 17 марта по 24 марта 2011 года (время работы с 9.00 до 16.30) либо 25 марта 2011 года по месту проведения собрания.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 10 марта 2011 года.

Регистрация участников собрания 25 марта 2011 года с 12.00 до 14.00 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания — 25 марта 2011 года в 14 часов 00 минут.**

Для регистрации при себе иметь документы, удостоверяющие личность.

УНП 100122846



## Открытое акционерное общество «СТОЛИЧНЫЙ ПРОСПЕКТ»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 24 марта 2011 года в здании клуба ОАО «Жабинковский сахарный завод» (Брестская обл., г. Жабинка). Начало проведения собрания в 12.30.**

**Повестка дня**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год и основных направлениях деятельности Общества в 2011 году.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе.
3. О результатах аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год и отчет ревизионной комиссии.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. Утверждение порядка распределения чистой прибыли за 2010 год. О выплате дивидендов за 2010 год.
6. Утверждение плана распределения чистой прибыли на 2011 год и 1 квартал 2012 года.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О назначении вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. О внесении изменений и дополнений в устав Общества.
10. Об утверждении показателя по экономии ресурсов Общества на 2011 год.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 01.03.2011 г. Регистрация участников — с 11.30 до 12.00 по месту проведения собрания.

УНП 290984478



**ООО «ЭКСПЕРТ-ФОРУМ» (организатор конкурса) по поручению ФХ «Савицкий В.В.» (продавец)**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 25 марта 2011 года КОНКУРСА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА в 11.00 в городе Гомеле по улице Островского, 101, кабинет 2-9

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи, с НДС, руб. РБ | Задаток, с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 333/С-20156 (здание нежилое) площадью 269,97 м² | 133 622 351 | 13 360 000 |

**Продавец: Фермерское хозяйство «Савицкий В.В.».**

**Имущество расположено по адресу:** г. Калинковичи, ул. Интернациональная, 32, 247710, Гомельская область.

Условия конкурса: Заявление цены, увеличенной от начальной цены не менее 8 %, сохранение целевого назначения, создание новых рабочих мест.

К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в конкурсе по форме, определенной организатором конкурса, внесли в установленном порядке задаток для участия в конкурсе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения конкурса.

Документы на участие в конкурсе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Островского, 101, каб. 2-9** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения ***по 24 марта 2011 г. включительно.*** Подача документов по почте не допускается.

При подаче заявления в адрес организатора конкурса представляются:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором торгов в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

**Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет Организатора конкурса: р/с 3012125680014 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Гомельской области, код 360, УНП 490655355.**

Победителями торгов будет признан участник, который предоставит наилучшее предложение по условиям конкурса. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах конкурса; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах конкурса; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение конкурса. Задаток, уплаченный участником конкурса, ставшим победителем, будет учтен в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

**Дополнительная информация по контактному телефону организатора конкурса: 8 (0232) 41 53 22.**


## Отчет Местного фонда развития сельских территорий «Возрождение—Агро» об использовании своего имущества за 2010 год

Количество учредителей Местного фонда развития сельских территорий «Возрождение—Агро» — 10 человек, из них 10 — физические лица.

**Информация о стоимости имущества местного фонда развития сельских территорий «Возрождение—Агро» (далее — Фонд):**

- стоимость имущества, переданного учредителями при учреждении Фонда, составляет 3 500 000 белорусских рублей;
- поступления от мероприятий, проводимых в соответствии с Уставом Фонда, составляет 83 589 220 белорусских рублей;
- поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством, — 19 955 479 белорусских рублей;
- доходов от предпринимательской деятельности, осуществляемой Фондом, — 683 880 белорусский рублей.

Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в Уставе Фонда, составляет 214 855 427 белорусских рублей.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности.

УНП 700164724


**ПРАДАЕЦЦА**

❒ Кнігі з хатняй бібліятэкі, вялікі выбар: фантастыка, дзіцячая літаратура, прыгоды. Тэл. 8017 2462045, 8 029 274 93 79.

❒ Рухавік Д-240 да МТЗ-80. Капрамонт. 1 камплект. Тэл. 8 029 772 73 37.


## Многоквартирный жилой дом неповышенной комфортности № 3 по генплану с помещениями общественного назначения, подземной автостоянкой в квартале улиц Одоевского, Бельского, Пономаренко, П.Глебки (продолжение) в г. Минске

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

***Информация о застройщике:*** Общество с ограниченной ответственностью «Антасам» зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета 18 марта 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100727641. Юридический адрес застройщика: 220093, Республика Беларусь, г. Минск, 4-ый Радиаторный пер., дом 4, комната 1.

Почтовый адрес застройщика: 220007, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Жуковского, дом 7, телефоны: 224 65 08, 224 65 09, 224 65 23.

Режим работы: понедельник – четверг с 9.00 до 18.00, пятница – с 9.00 до 16.45, выходные дни – суббота, воскресенье, обед с 13.00 до 13.45.

До настоящего проекта организация не осуществляла функции застройщика жилых домов и иных объектов недвижимости.

***Информация о проекте строительства***

**Цель строительства объекта** – осуществление инвестиционного проекта согласно договору с Минским городским исполнительным комитетом на реализацию права проектирования и строительства многоэтажного жилого дома неповышенной комфортности № 3 по генплану с помещениями общественного назначения, подземной автостоянкой в квартале улиц Одоевского, Бельского, Пономаренко, П. Глебки (продолжение) в г. Минске.

**Объект долевого строительства** – 5-секционный, 7-9-12-этажный многоквартирный жилой дом неповышенной комфортности №3 по генплану с помещениями общественного назначения, подземной автостоянкой в квартале улиц Одоевского, Бельского, Пономаренко, П.Глебки (продолжение) в г. Минске.

На первом этаже – помещение товарищества собственников, офисные помещения, аптека, магазины мелкорозничной торговли с самостоятельными входами. На втором этаже – офисные помещения. Общая площадь встроенных помещений общественного назначения – 4832 м². Высота встроенных помещений – 3,0 метра.

На третьем этаже и выше – жилые квартиры. Общая площадь квартир – 17016,8 м².

Количество жилых помещений (квартир) – 219. Высота жилых этажей – 2,75 метра. Количество машино-мест подземной автостоянки – 109. В квартирах предусмотрены летние помещения (остекленные балконы), в отдельных квартирах – балконы типа «французских». С планировкой квартир можно ознакомиться на Веб-сайте www.antasam.by.

Каждая секция оборудована мусоропроводом, грузопассажирскими лифтами.

В качестве несущей системы применен монолитный железобетонный каркас с монолитными железобетонными колоннами, плоскими безригельными монолитными перекрытиями и поэтажно опертыми наружными стенами из блоков ячеистого бетона.

Наружная отделка здания – защитно-декоративное полимерное покрытие, покраска фасадными красками, облицовка декоративными бетонными и керамическими плитками.

Предусмотрено устройство пандусов для лиц с ограниченными возможностями передвижения, санузлов для инвалидов.

Строительство будет осуществляться поэтапно, с выделением пусковых комплексов.

Начало строительства – апрель 2009.

Ввод в эксплуатацию жилой части дома:

I пусковой комплекс (7 и 9-этажные секции «А» и «Б») 4-ый и 5-ый подъезды – II квартал 2011;

II пусковой комплекс (12-этажная секция «В») 3-ий подъезд – IV квартал 2011;

III пусковой комплекс (9-этажные секции «Г» и «Д») 1-ый, 2-ой подъезды и гараж-стоянка – I квартал 2012.

Предлагается 2 000 (Две тысячи) квадратных метров жилых помещений для привлечения физических и юридических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства. Цена за один квадратный метр общей площади жилых помещений в текущих ценах на момент опубликования проектной декларации для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет:

- для однокомнатных, двухкомнатных, трехкомнатных квартир общей площадью до 100 м.кв. 3 670 000 рублей и 3 770 000 рублей;
- для трехкомнатных и четырехкомнатных квартир общей площадью свыше 100 м.кв. 3 550 000 рублей и 3 670 000 рублей;
- для трехкомнатных двухуровневых квартир 3 700 000 рублей.

Две цены одного квадратного метра общей площади зависят от размера первоначального взноса.

**Застройщиком получены:**

Акт выбора места размещения земельного участка утвержден Минским городским исполнительным комитетом 14.02.2008;

Разрешение на строительство Минского городского исполнительного комитета от 12.03.2009 № 481;

Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования на него от 09.04.2009 № 500/1110-45;

Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования на него от 09.04.2009 № 500/1110-46;

Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования на него от 09.04.2009 № 500/1110-47;

Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования на него от 09.04.2009 № 500/1110-48;

Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования на него от 09.04.2009 № 500/1110-49;

Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования на него от 09.04.2009 № 500/1110-50;

Проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «Госстройэкспертиза по городу Минску» от 27 февраля 2009 года № 0044-8-2009.

Разрешение на организацию стройплощадки, выданное инспекцией департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску № 2-208Ж-059/09 от 24.04.2009.

Разрешение на производство строительно-монтажных работ, выданное инспекцией департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску № 2-208Ж-059/09 от 26.04.2010.

Договор генерального строительного подряда с ООО «СУ-1 БЕЛБУД» № 2/2010 от 01.03.2010.

Отделка квартир не выполняется.

**Общее имущество, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков:**

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

**Сведения о благоустройстве:**

Озеленение территории, предусмотрено устройство тротуаров, дорожек и площадок с покрытием из мелкоразмерной бетонной плитки и асфальтобетона.

**Условия ознакомления с информацией по** объекту долевого строительства по тел.: 224 65 08, 224 65 09, 224 65 23 и непосредственно в офисе ООО «Антасам» по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, д. 7. Договора создания объекта долевого строительства заключаются только в офисе застройщика.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА**
**извещает о проведении аукциона с применением метода понижения начальной цены по продаже имущества республиканской собственности – 23 транспортных средств.**
**Аукцион состоится 28 марта 2011 г. в 15 часов по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35 (актовый зал).**

**Продавец:** Автотранспортное государственное учреждение «Белтрансспецавто» Управления делами Президента Республики Беларусь; 220004, г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35, конт. тел.: 200 28 23, 226 46 78.

**Организатор аукциона:** Минский городской территориальный фонд государственного имущества; 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, конт. тел. 200 20 89.

**НА АУКЦИОН ВЫСТАВЛЯЮТСЯ ЛЕГКОВЫЕ АВТОМОБИЛИ, НАХОДЯЩИЕСЯ НА ТЕРРИТОРИИ ПРОДАВЦА по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35**

| № лота | Полное наименование транспортных средств | Год выпуска | Инвентарный номер | Характеристики объектов республиканской собственности: номер кузова (шасси), цвет | пробег, тыс.км | объем двигателя, литров | краткое описание технического состояния | Начальная цена, рублей | Минимальная цена, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ГАЗ-3102 | 1999 | 4000 | 310200Х0097804, белый | 188,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 4 288 375 | 857 675 |
| 2 | ГАЗ-31022 | 1995 | 5226 | S0003270, белый | 317,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, основные узлы и агрегаты требуют кап. ремонта, требует замены шин колес | 3 725 526 | 745 105 |
| 3 | ГАЗ-31022 | 1995 | 5219 | S0003168, серо-белый | 363,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 2 335 404 | 467 081 |
| 4 | ГАЗ-31029 | 1996 | 3170 | Т0492430, светло-серый | 223,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 3 330 292 | 666 058 |
| 5 | ГАЗ-3110 | 1997 | 3418 | V0009729, темно-коричневый | 147,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 3 720 325 | 744 065 |
| 6 | ГАЗ-3110 | 1998 | 3383 | ХТН311000W0157010, серо-белый | 214,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 2 740 240 | 548 048 |
| 7 | ГАЗ-3110 | 2000 | 3517 | 311000Y0361598, белый | 209,0 | 2,3 | Сильная коррозия кузова, деформирован капот, требует замены шин колес | 4 515 595 | 903 119 |
| 8 | ГАЗ-3110 | 2001 | 3610 | 31100010441304, белый | 175,0 | 2,3 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 4 978 036 | 995 607 |
| 9 | ГАЗ-3110 | 2001 | 3572 | 31100010414464, белый | 194,0 | 2,3 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 5 124 449 | 1 024 890 |
| 10 | ГАЗ-3110 | 2001 | 3583 | 31100010416130, белый | 198,0 | 2,3 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 5 344 068 | 1 068 814 |
| 11 | ГАЗ-3110 | 2001 | 3609 | 31100010440774, белый | 236,0 | 2,3 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 4 904 830 | 980 966 |
| 12 | ГАЗ-3110 | 2002 | 3957 | 31100020493510, белый | 281,0 | 2,3 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 5 226 457 | 1 045 291 |
| 13 | ГАЗ-3102 00 | 1996 | 3095 | Т0049141, светло-серый | 292,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 3 243 084 | 648 617 |
| 14 | ГАЗ-3102 00 | 1996 | 3133 | ХТН310200Т0053147, светло-серый | 275,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 3 291 487 | 658 297 |
| 15 | ГАЗ-3102 00 | 1996 | 3137 | Т0056228, серый | 265,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 3 388 296 | 677 659 |
| 16 | ГАЗ-3102 00 | 1996 | 3172 | Т0058096, светло-серый | 294,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 3 243 084 | 648 617 |
| 17 | ГАЗ-310290 | 1996 | 3163 | Т0489757, черный | 170,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 3 330 292 | 666 058 |
| 18 | ГАЗ-310290 | 1996 | 3168 | Т0489482, серо-белый | 245,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 3 241 484 | 648 297 |
| 19 | ГАЗ-310290 | 1997 | 3215 | V0534156, серо-белый | 279,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 3 269 886 | 653 977 |
| 20 | ГАЗ-310290 | 1997 | 3231 | V0534094,серо-белый | 305,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 3 318 691 | 663 738 |
| 21 | ВАЗ-21074 | 1996 | 3262 | ХТА210740Т1001925, бежевый | 132,0 | 1,6 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 2 861 851 | 572 370 |
| 22 | Вольво-460 GL | 1995 | 3071 | XLBLC103ETC715862, белый | 348,0 | 1,8 | Сильная коррозия кузова, имеет место дефект рулевой рейки, требует замены шин колес | 4 600 802 | 920 160 |
| 23 | Мерседес – Бенц 200E | 1994 | 3193 | WDB1240191J069842, белый | 338,0 | 2,0 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес | 10 950 958 | 2 190 192 |

Порядок проведения аукциона, порядок оформления участия в аукционе, порядок определения победителя аукциона определен Положением о порядке продажи объектов республиканской собственности, на аукционах с применением метода понижения начальной цены, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 7 мая 2009 г. № 238».

Лицо, желающее принять участие в аукционе, подает Организатору аукциона заявление на участие в аукционе.

К подаваемому заявлению прилагаются:

**юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь:**

копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь:

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

**индивидуальным предпринимателем:**

документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

**физическим лицом:**

заверенная банком копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе Организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – нотариально заверенная доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения. Предмет торгов может быть снят с торгов по решению Продавца, Организатора аукциона, аукционной комиссии в любое время до объявления объекта проданным.

Участником аукциона до подачи заявления на участие в аукционе Организатору перечисляется задаток в размере 380 000 белорусских рублей на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Заявления принимаются с 23 февраля 2011 г. по 25 марта 2011 г. включительно.**

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику (претенденту на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение10 рабочих дней со дня утверждения Организатором аукциона протокола о результатах аукциона обязан возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации под роспись.

Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается не позднее 2 рабочих дней после возмещения вышеуказанных затрат.

Порядок и сроки осмотра транспортных средств установлен и производится Продавцом по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35, с понедельника по пятницу с 9.00 до 18.00 по 25 марта 2011 г. включительно. Контактные телефоны: (8 017) 200 28 23; моб. (8 029) 677 88 87. Гундилович Сергей Сергеевич, Маилянц Владимир Гарриевич; 150 — внутренний номер в учреждении «Белтрансспецавто».

# ГРАМНІЦЫ «АДГРЫМЕЛІ»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхары вёскі Новае Палессе Лельчыцкага раёна справілі традыцыйны абрад Стрэчанне з колішнімі песнямі, карагодам і грамнічнымі свечкамі.

# УЦЯГВАЕМСЯ Ў РЫНАК?

**Што сёння найбольш турбуе людзей? Тое, з чым чалавек сутыкаецца штодня. Найперш гэта зарплата, пенсія, рост цаны на прадукты, на лекі...**

Самымі хуткімі тэмпамі растуць цэны на прадукты харчавання, і гэтая тэндэнцыя назіраецца ва ўсім свеце. Але нам ад гэтага не лягчэй, і мы лепш паглядзім, што робіцца на нашым рынку.

Цэны ў Баранавічах, напэўна, адрозніваюцца ад сталічных, ды і ў глыбінцы яны іншыя, але разбежкі ў цане не будуць істотнымі.

Безумоўна, грэчка пабіла ўсе рэкорды. Упакоўка (800 г) каштуе 11,2 тысячы, а гэта значыць, што кілаграм гэтай крупы мае цану 14 тысяч рублёў. На другім месцы — бульба. З восені яна вырасла ў цане ўдвая. Напрыклад, за 10-літровае вядро бульбы просяць на рынку 16 тысяч. Неадборную можна купіць і танней. Вырас кошт і цвёрдых сыроў, паднялася цана на цукар...

Гэта найперш кідаецца ў вочы, а на сацыяльна значныя прадукты цэны фіксаваныя, і тут адметных скачкоў не назіраецца. А вось на салёнае сала ўжо які месяц цана не падымаецца вышэй за 16 тыс./кг. Ды і на мясныя прадукты кошт асабліва не расце. Месяц таму куплялі на рынку мясны фарш па 11,5 руб/кг, сёння — па 12 тысяч, выразка (кумпяк) была 13 500 руб. — цяпер на 500 рублёў даражэй.

Прагназуецца, што самымі высокімі тэмпамі будзе расці кошт агародніны, а гэта значыць, што ад сваіх дач не трэба адмаўляцца. Хоць часта даводзіцца чуць, што з іх няма прыбытку. А каб ён быў, то, напэўна, кілаграм цыбулі павінен каштаваць...

Тут мы сутыкаемся са спрадвечнай праблемай. Для спажыўцоў цэны заўсёды высокія, а для вытворцаў — нізкія.

Паводле інфармацыі інвестыцыйнага цэнтра FAO (арганізацыя ААН па харчаванні і сельскай гаспадарцы), сусветная аграрная сістэма не спраўляецца з сітуацыяй, якая склалася на рынках харчавання. Цэны на збожжа на сусветных біржах растуць, і эксперты лічаць, што эра таннай ежы закончылася.

Вось тут і трэба адзначыць, што палітыка ў нашай дзяржаве на развіццё і падтрымку сельскай гаспадаркі аказалася прадбачлівай, хоць у аграпрамысловым комплексе яшчэ непачаты край работы.

Але не толькі хлебам жыве чалавек. Акрамя крамаў і рынку, ён бывае і ў аптэках, а там свой бізнэс.

За савецкім часам у мікрараёне «Тэкстыльны пасёлак» была адна аптэка, а сёння — 4 ці 5, і толькі адна з іх дзяржаўная. Не ведаю, колькі іх павінна быць, але каб сёння прыватная аптэка выжыла, лекі павінны прадавацца. І ў аптэчным бізнэсе сітуацыя заблытаная для чалавека, які хварэе. Вось прыклад.

Пенсіянерка са сваёй праблемай звярнулася да ўчастковага ўрача, той абследаваў пацыентку, выпісаў рэцэпты і параіў, у якую аптэку звярнуцца. Хворая найперш зазірнула ў дзяржаўную аптэку, бо тая знаходзіцца побач з домам. Фармацэўт узяла тыя рэцэпты і ўважліва паглядзела на хворую: «Жанчына, вы не спяшайцеся, зараз я падлічу, колькі будзе каштаваць выпісанае вам лякарства, і затым вы рашайце».

Кошт выпісаных урачом лекаў пераваліў за 200 тысяч, і ў пенсіянеркі слёзы выступілі, бо ў кашальку было толькі паўсотні — думала, што хопіць. Пасля гэтага жанчына вырашыла звярнуцца ў адпаведны дыспансэр, а там увайшлі ў яе становішча, і лячэнне абышлося хворай у 39 тысяч.

Я не хачу нікога асуджаць, бо любы ўрач скажа, што яму лепш бачна, якія лекі выпісваць пацыенту, і яго падтрымаюць калегі. Але я ведаю, што нярэдка прэпараты беларускай вытворчасці, па магчымасці, блакіруюцца і пацыентам прапаноўваюцца дарагія імпартныя. Склалася цэлая сістэма, якая працуе на фармакалогію. Але, каб сістэма была эфектыўнай, неабходна падключаць да яе ўрачоў, бо ад іх залежыць, якое лякарства будуць купляць пацыенты.

Я кажу не пра ўсіх дактароў, сярод якіх шмат сумленных людзей, а ўказваю на сістэму, якая абслугоўвае фармакалагічны бізнэс. Аптэкі павінны даваць прыбытак! А калі чалавека прыцісне, то ён на лекі аддасць апошнюю тысячу. І калі, купляючы бульбу ці сала, ты можаш яшчэ патаргавацца, то ў аптэцы гэты варыянт адпадае.

Але бывае і інакш. Крамы, якія гандлююць бытавой тэхнікай, прапаноўваюць яе ў растэрміноўку, даюць пад пакупку крэдыты і зніжкі, якія дасягаюць 10-30 працэнтаў. Толькі купляй.

Рынак наступае, і мы ў яго ўцягваемся.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Погляд

# ЯКІЯ ДЗВЕРЫ МЫ АДЧЫНІМ?

**З БАЛАНСАВАЦЬ палітыку і эканоміку даволі складана. Часта апошняя бывае закладніцай першай і наадварот — эканамічныя правалы могуць прывесці да палітычных узрушэнняў.**

Я не хачу доўга затрымлівацца на падзеях у краінах паўночнай Афрыкі і Бліжняга Усходу. Узнікненню нестабільнасці там спрыялі эканамічныя, рэлігійныя і знешнія фактары. Успомнім, што выступленні пачаліся ў Тунісе і Егіпце, дзе палова насельніцтва жыве ў галечы. Менавіта эканамічны фактар і прывёў да палітычных узрушэнняў у гэтых краінах.

Эканамічная стабільнасць спрыяе стабільнасці палітычнай. Прапісная ісціна. У кожнай цывілізаванай краіне эканамічна-сацыяльным пытанням надаецца асаблівая ўвага. Сёння, калі наўкол пануе рынак, то ўсе імкнуцца цягнуць коўдру на сябе. Вялікая і больш багатая краіна можа дапамагчы меншай, але пры гэтым не забывае пра свае інтарэсы і прыбытак. Інтэрнацыянальныя, дружалюбныя, як і братэрскія адносіны, ужо не спрацоўваюць, як раней.

На ўтрыманні Савецкага Саюза былі дзясяткі рэжымаў па ўсім свеце. Дастаткова было нейкаму афрыканскаму правіцелю заявіць, што яго краіна будуе сацыялізм, як эканамічная дапамога была гарантавана, а крэдыты часта не вярталіся. Гэта былі часы, калі эканоміка абслугоўвала палітыку.

Прагматызм і жорсткая канкурэнцыя — рысы, уласцівыя капіталізму, а мы, бывае, працягваем думаць мінулымі катэгорыямі. Робім націск на братэрства і дружбу, а нас не чуюць. Прыбытак (выгада) маюць сёння вызначальнае значэнне. Не мы такія правілы адносін устанаўлівалі, але нам неабходна па гэтых правілах гуляць. А інакш нам пастаянна давядзецца сутыкацца з непрыемнымі нечаканасцямі і расчараваннем.

У сваім выступленні перад дэпутатамі першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка адзначыў, што сумесная з Іранам вытворчасць легкавых аўтамабіляў не дала чаканага выніку. За пяць гадоў было выпушчана і прададзена толькі 1 тысяча «Самандаў», ды і то купляліся яны на дзяржаўныя грошы для міліцыі ды іншых бюджэтных устаноў. Цяпер ёсць задума выпрацаваць сумесны беларуска-кітайскі «народны аўтамабіль».

Кітайцы — адна з самых прагматычных нацый у свеце. І калі яны даюць крэдыты, то, найперш, пад свае праекты, абсталяванне, рабочых і сваіх спецыялістаў. Кітайскі капітал зачышчае для сябе эканамічную прастору. А для беларускага боку самае важнае, каб тая аўтамашына была запатрабавана насельніцтвам. Спытайце сёння нашых аўтааматараў: ці хацелі б яны ездзіць на кітайскім аўтамабілі? А ці будзе тая легкавушка канкурэнтназдольнай на прасторах Мытнага саюза? На аўтамабільным рынку Расіі пануюць французскія, японскія, нямецкія, карэйскія... фірмы. Ды і сваю «Ладу» расіяне ў крыўду не дадуць.

Калі ж чуеш, што цана «народнага аўтамабіля» будзе ўсяго 7-8 тысяч долараў, то думаеш: «А ці будзе якасць яго адпавядаць сусветным стандартам? Ды і кошт, напэўна, значна падскочыць, пакуль з канвеера сыдзе першая аўтамашына?»

Ці далі адказы на гэтыя пытанні нашы спецыялісты? Ці не паўторыцца сітуацыя з іранскім «Самандам»? Эканамічныя інтарэсы сваёй краіны павінны быць на першым месцы. Дарэчы, кітайскія партнёры ў гэтым плане не маюць ілюзій — заўсёды імкнуцца мець выгаду. А нас, напэўна яшчэ, грэюць словы з песні, якую некалі спявалі па радыё кожную раніцу: «Масква — Пекін, ідуць, ідуць народы.... Мао і Сталін — браты назаўсёды...»

Наша краіна вельмі многа выпрацоўвае рознай тэхнікі, і свая (сумесная) легкавушка надвор'я не зробіць — вельмі вялікая канкурэнцыя. Магчыма, за лепшае будзе сканцэнтраваць увагу на вытворчасці малака і малочных прадуктаў. Гэта наша ніша на рынку, і ў перспектыве яе неабходна будзе толькі напаўняць.

Але ў кітайцаў ёсць чаму павучыцца. Дзелавітасць, прагматызм і вялікая працавітасць былі заўсёды ўласцівыя гэтаму народу. Кітай плаўна перайшоў ад сацыялізму да капіталістычнага рынку — тут ёсць што пераняць.

Пасля студэнцкіх хваляванняў у Пекіне, калі на галоўную плошчу Паднябеснай улады вывелі танкі, бацька эканамічных рэформаў у краіне Дэн Сяопін сказаў: «Перад намі двое дзвярэй. На адных напісана «палітыка» , а на другіх — «эканоміка». Калі мы адчынім першыя, то нас чакаюць бясконцыя канфлікты, калі ж адчынім другія, то ў нас усё атрымаецца».

Кітайцы аддалі перавагу эканоміцы і здзівілі ўвесь свет. Безумоўна, у Кітаі не ўсё адназначна, але ў краіне адбыўся небывалы эканамічны ўздым.

Чаму б нам не пайсці гэтым жа шляхам і не адчыніць дзверы ў эканоміку? А то часта ў нас, на мой погляд, кідае з эканомікі ў палітыку і наадварот. Ад усяго гэтага грукату нікому няма карысці. У эканоміку неабходна ўцягваць як мага больш людзей. Няхай яны аруць і сеюць, нешта выпрацоўваюць і гандлююць, а калі прыватнік ці нейкае прадпрыемства пойдзе не ў той бок, то ў дзяржавы заўсёды будзе магчымасць выправіць сітуацыю — рычагоў уздзеяння ўлада мае шмат. Трымаць сітуацыю пад кантролем неабходна, але прадпрымальнік, які плаціць спраўна падаткі, дзейнічае ў межах закона, павінен знаходзіцца пад абаронай дзяржавы.

А то чалавек адчыніў дзверы з шыльдай «эканоміка», пераступіў парог і трапіў у рукі чыноўнікаў, якія дзейнічаюць па інструкцыі, і да іх, быццам бы, не можа быць прэтэнзій. А хто піша тыя інструкцыі?

У Берліне на вуліцы ў белым халаце стаіць мужчына і з латка прадае бутэрброды, а далей — гарачыя сардэлькі. І гэта ў краіне, дзе людзі прывучаны да парадку і, здавалася б, такога не павінна быць, бо ёсць санітарныя нормы. Гэта ў нашых гарадах нормы. Успомнім, што нават за савецкім часам на кожным рагу з латкоў прадавалі газаваныя напоі, марожанае, піражкі, каб было зручней людзям. Праўда, сёння па электрычках жанчыны носяць тое-сёе з прадуктаў, але гэты гандаль падпольны. Чаму? Можна ў горадзе абысці цэлы мікрараён і не знайсці месца, дзе можна было б «законна» выпіць чарку і прыкусіць. Можа, нейкі прыватнік і адчыніў бы «забягалаўку» на два столікі, але дазвол на гандаль алкагольнымі напоямі мясцовая ўлада дае па сваім меркаванні — гэты атрымае, а той не. Да яшчэ ёсць інструкцыі. У прынцыпе, дробны бізнэс не з'яўляецца вызначальным, але ў яго могуць быць уцягнуты тысячы людзей, а гэта палёгка для дзяржавы.

Напрыклад, у Кітаі адна вёска займаецца вырабам зубных шчотак, другая — прышчэпак для бялізны, а ў трэцяй нешта шыюць... і прадукцыя іх ідзе на экспарт у розныя краіны — няхай і не самыя багатыя. Галоўнае — раскруціць эканамічны махавік на ўсіх узроўнях.

Можа, яго раскруціць Дырэктыва № 4? Прэзідыум Савета Міністраў у цэлым адобрыў праект плана мерапрыемстваў па рэалізацыі Дырэктывы № 4. А міністр эканомікі Мікалай Снапкоў заявіў, што план прадугледжвае распрацоўку і прыняцце 150 нарматыўных прававых актаў, якія павінны ўдасканаліць дзелавы клімат для ўсіх суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці і, у канчатковым выніку, фарміраванне камфортнага дзелавога асяроддзя.

У першым паўгоддзі гэтага года нарматыўна-прававыя акты для рэалізацыі Дырэктывы № 4 будуць прыняты. А на працягу года, у адпаведнасці з планам, будуць рэалізаваны асноўныя мерапрыемствы.

Што ж, 2011 год, магчыма, стане вызначальным. Будзем спадзявацца, што дзверы нашай эканомікі будуць шырока расчынены для ўсіх, хто захоча заняцца прадпрымальніцтвам.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**



Крымінал

## ПА 12 ГАДОЎ — ЗА 12 КГ НАРКОТЫКУ

**Суд Валожынскага раёна прыгаварыў двух жыхароў Смалявіч да 12 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ва ўмовах узмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Касацыйная скарга пакінутая без задавальнення.**

У згаданых асоб канфіскавана 12 кг асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва — параметылэфедрону. Падазроныя былі затрыманы аператыўнай групай упраўлення КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці каля паста вагагабарытнага кантролю транспартных сродкаў «Пяршаі», што ў Валожынскім раёне Мінскай вобласці. Наркагандляры набылі каля 12 кг параметылэфедрону ў Літоўскай Рэспубліцы, упакавалі рэчыва ў 12 палімерных скруткаў, змясцілі ў паліўны бак аўтамабіля «Фальксваген-Транспарцёр» і кантрабандным шляхам правезлі ў Беларусь. Збываць наркарэчыва планавалася як на тэрыторыі самой Беларусі, так і ў Расіі і ва Украіне. Падчас афармлення працэсуальных дакументаў затрыманыя прапаноўвалі супрацоўнікам сталічнага ўпраўлення КДБ буйны хабар за вызваленне ад крымінальнай адказнасці.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ПАБІЎ ШЧОТКАЙ 71-ГАДОВУЮ

**У Шаркоўшчынскім раённым аддзеле ўнутраных спраў высвятляюць, чаму 30-гадовы мужчына пабіў сваю 71-гадовую суседку па доме.**

Пасварыліся, і сусед прама ў пад'ездзе а пятай гадзіне дня пакалаціў драўлянай шчоткай пенсіянерку. У дачыненні да беспрацоўнага хулігана заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ
### Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, пр. Черняховского, 9

**Аукцион по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома**

| № лота | Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка | Функциональное назначение земельного участка | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) | Размер задатка и реквизиты для его внесения |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 221281201101000295 площадью 0,1248 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, аг. Вороны, ул. Стадионная, 14А | Для строительства и обслуживания жилого дома | Возможность подключения централизованного газо- и водоснабжения, примыкает к асфальтированным дорогам и улицам. Ограничения в использовании: водоохранная зона вне прибрежной полосы оз. Полонское, охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В. | 3 953 635 | 395 360 бел. руб. на р/с 3600314020012 в фил-ле 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, код платежа 04901, УНП 300972045, получатель платежа: Вороновский сельский исполнительный комитет |
| 2 | Земельный участок с кадастровым номером 221281201101000294 площадью 0,1070 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, аг. Вороны, ул. Ленинская, 31А | Для строительства и обслуживания жилого дома | Возможность подключения централизованного газо- и водоснабжения. Ограничения в использовании: водоохранная зона вне прибрежной полосы оз.Полонское, охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В. | 3 081 578 | 308 150 бел. руб. на р/с 3600314020012 в фил-ле 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, код платежа 04901, УНП 300972045, получатель платежа: Вороновский сельский исполнительный комитет |
| 3 | Земельный участок с кадастровым номером 221284808601000198 площадью 0,2191 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Малые Летцы, ул. Шоссейная | Для строительства и обслуживания жилого дома | Возможность подключения централизованного газо- и водоснабжения. Ограничения в использовании: водоохранная зона вне прибрежной полосы р. Зароновка, охранная зона систем газоснабжения. | 4 319 087 | 431 900 бел. руб. на р/с 3600314080010 в Витебском ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801259, УНП 300976663, код платежа 04901, получатель платежа: Летчанский сельский исполнительный комитет |

Дата, время и место проведения аукциона: 29.03.2011 в 15.00. Место проведения аукциона: г. Витебск, пр-т Черняховского, д. 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов: 23.03.2011 до 17.30.

**Аукцион по продаже права заключения договоров аренды земельных участков**

| № лота | Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка, предлагаемого в аренду | Функциональное назначение земельного участка, срок аренды | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель | Начальная цена права заключения договора аренды (бел. руб.) | Размер задатка и реквизиты для его внесения |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 221287013101000102 площадью 0,1452 га, расположенный по адресу: Витебская область, г. Витебск, Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Осиновка, ул. Приозерная, д. 1 | Под размещение магазина. Срок аренды 20 лет. | Возможность подключения централизованного газоснабжения, примыкает к асфальтированным дорогам и улицам. Ограничения в использовании: водоохранная зона вне прибрежной полосы озера Добрино. | 780 520 | 78 052 бел. руб. на р/с 3602314000014 в филиале № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 259, УНП 300196132, код платежа 04002. Получатель платежа: фин. отдел Витебского райисполкома |

Дата, время и место проведения аукциона: 29.03.2011 в 16.00. Место проведения аукциона: г. Витебск, пр-т Черняховского, д. 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов: 23.03.2011 до 17.30.

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр. Черняховского, д. 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отсутствуют.

**Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:**

- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения по каждому объекту (лоту), выставляемому на аукцион, доводится до сведения участников до начала аукциона;
- подписать протокол аукциона в день проведения аукциона, оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, указанные в протоколе аукциона;
- в случае приобретения зем. участка в частную собственность – осуществить в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права собственности на земельный участок. В случае приобретения права аренды не позднее 2-х рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнений условий, указанных в протоколе аукциона, заключить с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка; осуществить государственную регистрацию в двухмесячный срок со дня заключения договора аренды;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

1. **Для участия в аукционе** приглашаются: при продаже земельного участка в частную собственность – граждане Республики Беларусь, при продаже права на заключение договора аренды земельного участка – граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица. Гражданин, индивидуальный предприниматель, юридическое лицо должны подать заявление об участии в аукционе и подписать соглашение с организатором аукциона. К заявлению прилагается:

- для граждан – копия документа, содержащего идентификационные сведения гражданина;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- для представителей гражданина и индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона.

2. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка.

3. В случае отказа или уклонения Победителя аукциона в установленный срок от внесения платы за предмет аукциона, выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, внесенный им задаток и затраты на организацию и проведение аукциона возврату не подлежат.

4. Контактные тел.: (0212) 47 97 35, (029) 514 36 47, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by, www.gki.gov.by.


Зварот у рэдакцыю

# НЕБЯСПЕЧНЫЯ СТАСУНКІ
## альбо «Рызыкі захварэць на сухоты ў дыспансэры адназначна няма!»

У рэдакцыю «Звязды» звярнуўся чытач. У адпаведнасці з сучаснымі тэндэнцыямі, ліст нам даслалі па электроннай пошце. Праўда, скарга не падпісана, але з просьбай даслаць адказ на канкрэтны электронны адрас. Гэты ліст датычыцца сферы аховы здароўя: чалавек (мы не ведаем, жанчына нам напісала альбо мужчына) наракае, што, на яго погляд, не ўсюды медыцынская навука скіраваная на карысць пацыента і яго хутчэйшую папраўку.

Чытач расказвае, што ён захварэў на сухоты, трапіў на дыягностыку і лячэнне ў Магілёўскі абласны супрацьсухотны дыспансэр і застаўся незадаволены. Далей ідзе падрабязны расповед пра рэжым і сродкі абароны ад інфекцыі. На думку скаржніка, сістэма настолькі недасканалая, што з'яўляецца новая рызыка захварэць!

*«Вельмі прашу вас адказаць на мой ліст дзеяннямі па навядзенні там элементарнага парадку, якога павінны прытрымлівацца ў інфекцыйных установах!»*

Таксама былога пацыента дыспансэра непакоіць сітуацыя з наяўнасцю лекаў, умовы для пражывання — памяшканні патрабуюць рамонту, існуюць праблемы з мэбляй і мяккім інвентаром.

*«Кантынгент тут лечыцца ў большасці «мінусавы». Калі сюды трапіў чалавек з нармальным ладам жыцця, то ўсё гэта можа закончыцца сумна. Многія не вытрымліваюць гэтай прыгнятальнай абстаноўкі, што прыводзіць да нервовых зрываў. Вельмі хацелася б, каб наша ахова здароўя звярнула ўвагу на Магілёўскі супрацьсухотны дыспансэр. Тут можа апынуцца любы чалавек! Але вылечыцца пры такой абстаноўцы цяжка і не ў кожнага атрымліваецца».*

Што праўда ў гэтым лісце, а што не? Якія існуюць сапраўдныя праблемы, а дзе толькі эмоцыі? Пракаментаваць ліст нашага чытача мы папрасілі **галоўнага ўрача Магілёўскага абласнога супрацьсухотнага дыспансэра Анатоля ПРАНОВІЧА.**

— Я ўважліва пачытаў зварот чалавека, які, хутчэй за ўсё, лячыўся ў нашым дыягнастычным аддзяленні. Я ўдзячны тым нашым пацыентам, якія не застаюцца абыякавымі і, калі бачаць нейкія недахопы, уздымаюць гэтыя пытанні.

Я магу растлумачыць сітуацыю, якую, напэўна, неспецыяліст у медыцыне не вельмі добра зразумеў альбо неадэкватна ацаніў. І адначасова я хачу выказаць шкадаванне, што аўтар ліста ў «Звязду» не звярнуўся па тлумачэнне да медыкаў падчас лячэння ў нас, каб высветліць усё на месцы. Але трэба прызнаць, што ў лісце закрануты і такія моманты, якія хвалююць мяне гэтаксама, як і нашага пацыента.

Але пра ўсё па парадку. Па-першае, наша дыягнастычнае аддзяленне прызначана для выяўлення тых, хто хварэе на сухоты, а хто — на іншыя захворванні. Не заўсёды ж адразу зразумела, дзе сухоты, а дзе пнеўманія ці нават анкалогія. Хваробы маскіруюцца, і менавіта з гэтай праблемай разбіраюцца ў дыягнастычным аддзяленні.

Аднак першая ўмова для шпіталізацыі ў гэтае аддзяленне — так званая небацылярнасць. Гэта азначае, што ў хворага не выдзяляюцца мікабактэрыі сухотаў. Такім чынам, пацыенты ў дыягнастычным аддзяленні не могуць інфіцыраваць адно аднаго. Там могуць апынуцца хворыя на так званую закрытую форму сухотаў, калі бактэрыі ў знешняе асяроддзе не трапляюць альбо трапляюць у настолькі нязначнай колькасці, што іх немагчыма выявіць.

Рызыкі захварэць на сухоты падчас дыягностыкі няма. Адназначна няма. Трывогі чалавека, які звярнуўся ў газету, дарэмныя. Я ўжо не першы год працую ў дыспансэры і скажу згодна са сваёй практыкай, што я не бачыў ніводнага чалавека, які б захварэў на сухоты ў дыягнастычным аддзяленні.

У нас падзяляюцца патокі хворых, што перашкаджае захворванням на сухоты ўнутры дыспансэра. Бацылярныя сухоты лечацца асобна. Здараюцца такія выпадкі, калі ў хворага адкрываецца бацылавыдзяленне. Крайне рэдкі выпадак, але магчымы. Мы такіх пацыентаў адразу ж пераводзім, але кантакт з імі раўназначны бытавому, калі, напрыклад, знаходзішся побач у аўтобусе.

Мы прымаем усе меры, каб змешвання не было. І калі здараюцца нейкія парушэнні рэжыму, то мы заўважаем і прыцягваем да адказнасці персанал. Але яшчэ раз заўважу, што такія праблемы трэба вырашаць на месцы.

Мяне больш хвалюе, як пацыенты адзываюцца пра нашу матэрыяльную базу. Пра тое, што лекаў няма, — выкладзена ў лісце, я лічу, няправільна. Для неабходнага планавага лячэння, якое прызначаецца хворым, медыкаментаў дастаткова. Але калі чалавек хоча атрымліваць дадатковыя лекі і працэдуры, то ён можа атрымаць іх за свой кошт. Гэта яго выбар: як і ў тым, ці выконваць нашы рэкамендацыі па прыёме лекаў для папярэджання ў далейшым захворванняў.

Аднак — матэрыяльная база. Наша лячэбная ўстанова размешчана ў нетыпавых будынках 60-х гадоў мінулага стагоддзя. За савецкім часам гэта была арцель, памяшканні гаспадарчага прызначэння і інтэрнаты. На іх базе і зрабілі дыспансэр. З-за пэўных асаблівасцяў не заўсёды проста стварыць поўныя ўмовы для камфортнага пражывання нашых пацыентаў. Будынкі старыя, і, каб прывесці іх у добры стан, патрабуюцца немалыя сродкі. Грошы, якія штогод выдаткоўваюцца на ўтрыманне нашай установы, выкарыстоўваюцца поўнасцю. Бюджэт супрацьсухотнага дыспансэра сёлета складзе 18 з лішкам мільярдаў рублёў. Гэта вялікія сумы, але ўсё роўна і іх недастаткова.

І гэтыя грошы, вядома ж, прызначаюцца не толькі на рамонт. У нас паўтысячы месцаў для хворых на сухоты, і яшчэ 150 — на іншыя хваробы. Ёсць праблемы і з мяккім інвентаром — гэта коўдры, падушкі, бялізна. Шукаем рэзервы, прыцягваем спонсараў. Сёлета запланавалі супрацоўніцтва з цэнтрам занятасці і спадзяёмся, што закрыем гэтае пытанне. Розныя праблемы, безумоўна, ёсць у дзейнасці Магілёўскага супрацьсухотнага дыспансэра, але яны паступова вырашаюцца, калі паступаюць сродкі.

Хачу таксама сказаць, што мяне радуе насцярожанасць насельніцтва наконт сухотаў, што і дэманструе ліст. Бо дзякуючы і гэтай насцярожанасці таксама ды мерам, якія прымаюцца для абароны ад хваробы, штогод памяншаецца захваральнасць на сухоты. У 2010 годзе, у параўнанні з папярэднім, яна знізілася яшчэ на 5,7%.

У нас добрыя паказчыкі эфектыўнасці лячэння: 92% хворых пайшлі на папраўку, сталі здаровыя і атрымалі пуцёўку ў нармальнае жыццё. У далейшым усё будзе залежыць ад таго, як яны прытрымліваюцца рэжыму і нармальнага ладу жыцця. Таму што, на жаль, многія потым зноў вяртаюцца да нас: гэта датычыцца асацыяльных асоб, якія злоўжываюць алкаголем і іншым, што спрыяе захворванню на сухоты. Так што сцеражыцеся і не хварэйце.

**Падрыхтавала Ілона ІВАНОВА.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 894. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

